# СЛАВЯНСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ

Пад такой назвай 25—30 кастрычніка 1993 г. на філалагічным факультэце адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя. У яе рабоце прынялі ўдзел звыш 70 навукоўцаў нашай краіны, а таксама навуковых цэнтраў славяназнаўства Расіі, Украіны, Малдовы.

Адкрыў канферэнцыю дэкан філалагічнага факультэта, член-карэспандэнт Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, загадчык кафедры беларускай літаратуры, доктар філалагічных навук, прафесар А. А. Лойка. У сваім дакладзе «Старабеларуская літаратура ў еўрапейскім кантэксце» ён вызначыў асноўныя пункты перакрыжаванняў нашай літаратуры з еўрапейскай, паказаў яе вялікую гуманістычную накіраванасць, агульначалавечы змест, яе ўплыў на развіццё іншых літаратур.

Лагічным прадоўжваннем асноўных палажэнняў даклада праф. А. А. Лойкі з'явілася слова доктара філалагічных навук з Масквы С. А. Шарлаімавай аб славянскіх міжлітаратурных сувязях у XX ст. На пленарным пасяджэнні быў заслуханы таксама цікавы даклад доктара філалагічных навук У. Д. Сядзельніка «Шматмоўе, міжлітаратурнасць і нацыянальнае самаадчуванне». На прыкладзе сітуацыі ў Швейцарыі дакладчык акрэсліў тыя агульныя рысы, якія тычацца культурнага развіцця ў краінах, дзе існуе двухмоўе.

Плённай і вельмі цікавай была работа ў секцыях. Яна паказала шматграннасць аспектаў вывучэння славянскіх літаратур, разнастайнасць навуковых пошукаў, дазволіла вызначыць прыярытэты ў гісторыка-тэарэтычных даследаваннях. Тэма «Тыпалогія культур розных рэгіёнаў, міжнацыянальных супольніцтваў, сусветнай літаратуры» аб'яднала работу па чатырох напрамках. Тэарэтычным аспектам яе былі прысвечаны даклады Г. Г. Тварановіч «Тып літаратуры — тыпалогія сутнасцей», Л. Е. Кавальчук «Тыпалогія і жанравая своеасаблівасць біяграфічнай прозы», Н. М. Саркісавай «Праблемы сімвала і алегорыі ў паэтыцы рамантызму», А. А. Андрэева «Нацыянальнае ў літаратуры».

Канкрэтныя праявы агульнасці літаратур розных рэгіёнаў і рэцэпцыя твораў нацыянальных літаратур на іншай глебе склалі асновы дакладаў Масленнікавай Н. В. «Ф. М. Дастаеўскі ў Сербіі міжваеннага перыяду», Сарокінай В. В. «Руская гарадская проза 60—70-х гг. у нямецкай крытыцы», Шэнкен А. Г. «Руская літаратура 1980-х гадоў у Сербіі: пераклады, інтэрпрэтацыя ў крытыцы», Сініла Г. В. «Рэцэпцыя біблейскіх вобразаў у лірыцы Рыльке і Пастэрнака» і інш.

Асабліва разнастайнымі і шматлікімі былі паведамленні ў секцыі «Нацыянальнае і агульначалавечае ў славянскіх літаратурах». Аб'ектам даследаванняў з'явіліся ў асноўным беларуская, польская і чэшская літаратуры. Менавіта іх узаемасувязі, праблемы іх развіцця, актуальныя аспекты паэтыкі былі разгледжаны ў дакладах Н. Ф. Капысцянскай, А. Г. Машковай, Р. Р. Кузняцовай (усе яны з Масквы), В. С. Вешторта (Гродна), І. М. Ключановіч (Мінск), А. М. Сувалавай (Гомель), В. М. Вайлупавай (Магілёў).

Параўнальна-тыпалагічнаму вывучэнню славянскіх літаратур у еўрапейскім кантэксце былі прысвечаны даклады праф. І. В. Шаблоўскай «Чэшскі тэатр абсурду і еўрапейскі вопыт», С. Я. Ганчаровай «Д. Хармс і французскі тэатральны авангард», Д. Л. Башкірава «Творчасць Л. Андрэева і нямецкі экспрэсіянізм», В. В. Халіпава «Раман У. Эка «Імя розы» у кантэксце сусветнай постмадэрнісцкай літаратуры», І. С. Скарапанавай «Праблема духоўнага існавання ў сусветнай паэзіі XX ст. і загадка «Заблудившегося трамвая» М. Гумілёва». У гэтых і іншых дакладах і паведамленнях удзельнікі канферэнцыі звярнуліся да розных аспектаў параўнальнай паэтыкі, жанравай спецыфікі твораў, форм сюжэта і кампазіцыі.

Шэраг дакладаў, прачытаных на дзвюх секцыях, аб'яднаных тэмай «Руская літаратура: праблемы і традыцыі», выклікалі спрэчкі, ажыўлены абмен думкамі. На падсекцыі «Руская класічная літаратура» дыяпазон закранутых тэм быў вельмі шырокі. Паведамленні Л. І. Зарэмба пра малавядомы рукапіс «Слова аб палку Ігаравым», Г. М. Праневіча «Сінкрэтызм і функцыянальная універсальнасць мастацкага вобраза ў «Слове», Т. В. Аўтуховіч «Мадэль антычнага свету ў творчай свядомасці

Ф. Эміна» адкрывалі старонкі старажытнай літаратуры. Даволі цікавым быў даклад А. А. Звознікава «Записки из подполья» Ф. М. Дастаеўскага ў кантэксце сусветнай літаратуры», асноўная думка якога даводзіла, што пісьменнік (разам з Ібсэнам і К'еркегорам) з'явіўся адкрывальнікам тыпу «чалавека без уласцівасцей». Асобныя паведамленні былі прысвечаны новым падыходам да творчасці Пушкіна, Вяземскага, Лермантава, Вяч. Іванова.

Пытанні методыкі выкладання літаратуры ў школе былі ў цэнтры паведамленняў Е. А. Лявонавай, Т. Е. Зыль, В. А. Каравушкінай.

У падсекцыі «Літаратура XX стагоддзя» разгледжана шырокае кола пытанняў, якія стаяць перад даследчыкамі рускай літаратуры XX ст. Абагульняючы змест, тыпалагічны падыход характарызавалі выступленні «Руская літаратура XX ст. як мастацкае цэлае» Чэрнікава (Калуга), «Руская утапічная паэзія пачатку XX стагоддзя» Іванюшынай І. Ю. (Саратаў). Большая частка дакладаў прысвечана даследаванню асобных праблем паэтыкі мастацкага твора, яго гісторыка-культурнага існавання (даклады праф. С. А. Лысенка, І. Г. Дабрыцкай, В. Л. Краўцова, Л. М. Шумскай).

Разам са старэйшымі вучонымі ў канферэнцыі прынялі ўдзел не толькі аспіранты, але і студэнты. Дарэчы, даклад студэнта III курса У. Капцава «Тыпалогія герояў Мeражкоўскага» адзначаўся высокім філасофскім і літаратуразнаўчым узроўнем і выклікаў зацікаўленасць прысутных. Увогуле, даклады, прачытаныя на канферэнцыі, у большасці змястоўныя, глыбокія, арыгінальныя. Канферэнцыя, безумоўна, абагаціла яе ўдзельнікаў новымі ідэямі, паказала плённасць такіх сустрэч і навуковага абмену думкамі.

Г. Л. Няфагіна